УДК 821.161.3.09

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ ЛІТАРАТУРНЫХ ТЭКСТАЎ ДЛЯ ДЗІЦЯЧАГА ЧЫТАННЯ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЎРОКА РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ Ў ШОСТЫМ КЛАСЕ
## (Беларуская літаратура. Першы блок урокаў)

*Аўтар:* ***Макарэвіч Алесь Мікалаевіч,*** *загадчык кафедры беларускай літаратуры*

**Кантактная інфармацыя:** тэл.: (+375 222) 23-77-41,
эл. пошта: olekmak@mail.ru

**Апісанне:** *Прадстаўлена характарыстыка этапаў і формаў працы ў ходзе падрыхтоўкі вучняў да выканання творчага задання на ўроку развіцця маўлення (6 клас, 1-ы блок урокаў).*

**Description:** *The article presents the description of the stages and activities involved in the process of preparing pupils for their creative tasks aimed at the development of their speech (6 Form, Unit 1).*

**Галіна прымянення распрацоўкі:** Адукацыя.

**Асноўныя перавагі распрацоўкі**: Прапаноўваецца комплекснае планаванне этапаў урокаў па вывучэнні міфалогіі і твораў з міфалагічнымі матывамі ў кантэксце ўроку пазакласнага чытання па беларускай літаратуры і падрыхтоўкі да ўроку развіцця маўлення ў 6-м класе па сістэме перспектыўных ліній; дадзеная распрацоўка з’яўляецца працягам апублікаванай раней аўтарскай метадычнай сістэмы працы па развіцці маўлення ў 5-м классе.

Асноўныя метадычныя зыходныя па рацыянальнай арганізацыі працы настаўніка і вучняў па сістэме перспектыўных ліній (далей – СПЛ) у кантэксце ўрокаў пазакласнага чытання і развіцця маўлення (пяты клас) вызначаны ў



тронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулеш

ранейшай публікацыі аўтара гэтай распрацоўкі [2, с. 213]. Таму ў дадзеным выпадку непасрэдна звяртаемся да канкрэтнай характарыстыкі этапаў, форм і зместу працы настаўніка і вучняў у гэтым напрамку ўжо ў шостым класе на прыкладзе першага ўрока пазакласнага чытання (далей – ПЧ) і першага ўрока развіцця маўлення (далей – РМ)

Планаванне ўрокаў пазакласнага чытання і ўрокаў РМ мэтазгодна здзяйсняць у той паслядоўнасці, як гэта прапанавана для пятага класа [2, с. 213]. Калі ж настаўнік з'яўляецца прыхільнікам абсалютнага следавання парадам "Прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання…" (далей – ПКТП), то ўрок ПЧ можна правесці сёмым, як на гэта арыентуе ПКТП. Але і ў адным, і ў другім выпадку настаўнік павінен вырашыць наступную праблему: які твор з прапанаваных "Вучэбнай праграмай…" варта выбраць, каб ён арганічна далучаўся да працэсу развіцця маўлення вучняў.

У сувязі з гэтым прапануем вынесці на першы ўрок ПЧ п'есу-казку Л. Рублеўскай "Янук, рыцар Мятлушкі". Па-першае, гэты твор можа стаць цікавым, займальным, доказным уступам да раздзела падручніка "Свет загадак і цудаў"; па-другое, пры яго характарыстыцы на ўроку ПЧ можна будзе праілюстраваць асаблівасці выкарыстання міфалагічных матываў у мастацкай літаратуры; па-трэцяе, гэтая п'еса-казка можа стаць у далейшым наглядным і пераканальным прыкладам для вучняў у працэсе іх падрыхтоўкі да ўрока РМ і выканання задання па ім.

Магчымыя формы падрыхтоўчай (на перспектыву ўспрымання) і непасрэднай працы з гэтым творам: **а)** заданні – у працэсе чытання п'есы-казкі вызначыць паходжанне дзеючых асоб твора; выявіць эпізоды, у якіх праяўляюцца рысы характару Янука і Мятлушкі, вызначыць гэтыя рысы; прасачыць, у якіх абставінах і як змяняюцца рысы характару Янука; падрыхтаваць характарыстыку знешнасці герояў п'есы; растлумачыць сэнс фінальнага выказвання Мятлушкі пра тое, што яна і Янук будуць самымі багатымі ў свеце; **б)** на ўроку ПЧ – характарыстыка твора ў адпаведнасці з прапанаванымі вышэй заданнямі для вучняў; заключнае слова настаўніка пра асаблівасці выкарыстання сучасным аўтарам скарбаў беларускай міфалогіі.

Першы (у агульнай нумарацыі ўрокаў № 15) урок развіцця маўлення ў шостым класе прапаноўваецца ПКТП як абагульняючы ўрок па раздзеле падручніка "Свет загадак і цудаў". Звернемся да вызначэння метадычных зыходных, улік якіх дазваляе рацыянальна спланаваць дадзены ўрок РМ і наладзіць эфектыўную да яго падрыхтоўку. Пры гэтым звернем увагу толькі на тыя аспекты працы, якія непасрэдна тычацца падрыхтоўкі да ўрока РМ.

**1.** Вынікам абагульняльнай працы на ўроку РМ павінна быць "*вусная замалёўка пра міфалагічнага бога або духа (з апорай на літаратурныя і жывапісныя творы*" [3]. Назапашванне ж вучнямі ведаў пра міфалагічных герояў павінна здзяйсняцца на папярэдніх (№№ 8 – 14) уроках.

**2. Урок № 8** – *Узнікненне вобразнага, мастацкага слова. Міфы пра багоў.* Па яго выніках вучні дома павінны будуць скласці "*вусную замалёўку пра аднаго*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*з міфалагічных багоў*" [3]. Гэта фактычна самы першы падрыхтоўчы этап да ўрока РМ і выканання задання па ім. І тут важным з'яўляецца тлумачэнне вучням неабходнасці і перспектыў добрасумленнага выканання тых заданняў, якія дапамогуць падрыхтаваць творчую работу па ўроку РМ.

У сувязі з акрэсленым вышэй тлумачэнне дамашняга задання па ўроку № 8 можа мець наступную форму: **а)** вызначэнне алгарытмаў выканання задання: прачытаць артыкул падручніка [3, с. 36-40]; выбраць вобраз таго бога, пра якога з'явілася жаданне зрабіць замалёўку; падрыхтаваць кароткі пераказ той часткі артыкула, у якой ідзе гутарка пра выбранага вучнем бога; дапоўніць пераказ інфармацыі пра бога кароткай (пажадана ў пісьмовай форме) гісторыяй пра магчымы вынік яго дзейнасці (пры гэтым варта звярнуць увагу вучняў на тое, што складзеныя імі гісторыі, затым дапоўненыя і развітыя на наступных уроках, у працэсе выканання дамашніх заданняў, могуць быць выкарыстаны пры выкананні задання па ўроку РМ; **б)** тлумачэнне канчатковай структуры задання (яе варта прапанаваць у раздрукаваным выглядзе): *уступ* – чаму менавіта гэты бог зацікавіў вучня; *знешні выгляд бога*; *прызначэнне бога* – напрыклад: Ярыла абуджае прыроду пасля зімовага яе сну, дае ўсім істотам моц (ярасць) [1, с. 37]; *уласная гісторыя* – напрыклад: Ярыла спускаецца з неба на зямлю, саграваe яе сваім агнём, нараджаецца ад яго цяпла кветка (апісаць выгляд кветкі, яе адчуванні, захапленне вясной, удзячнасць Ярылу).

**3. Урок № 9** – *Міфы пра духаў.*

**3.1.** Праверка дамашняга задання: **а)** выбарачнае расказванне вучнямі падрыхтаваных замалёвак; **б)** парады настаўніка адносна ўдасканальвання агучаных вучнямі замалёвак з перспектыўным выхадам на творчае заданне па ўроку РМ (гэтыя парады могуць быць выкарыстаны таксама тымі шасцікласнікамі, якія не прымалі непасрэдны ўдзел у расказванні замалёвак).

**3.2** Тлумачэнне дамашняга задання да наступнага ўрока (яго варта здзяйсняць адразу пасля праверкі дамашняга задання па ўроку № 8): форма можа быць падобнай да той, якая прапанавана да папярэдняга ўрока; змест жа адрозніваецца тым, што вучні павіны будуць падрыхтаваць замалёўку пра "*адну з міфічных істот*" [3].

**4. Урок № 10** – *Янка Купала. "Як у казцы".*

**4.1** Праверку дамашняга задання варта здзяйсняць пасля знаёмства з творам Я. Купалы і гутаркі па ім. Фінальным пытаннем для абмеркавання можа быць тое, што прапанавана ў падручніку, – *што сталася са старымі багамі, як пра гэта гаворыць аўтар* [1, с. 48].

У якасці ілюстрацыі да высновы Я. Купалы пра тое, што "*старыя багі*" жывуць "*у песнях, казках, паданнях*", могуць быць падрыхтаваныя вучнямі ў якасці дамашняга задання да гэтага ўрока замалёўкі пра міфічных істот. У дадзеным выпадку можна прапанаваць каму-небудзь з шасцікласнікаў расказаць падрыхтаваную раней гісторыю пра паганскага бога, а затым – некалькі замалёвак пра міфічных істот. Такім чынам зноў здзяйсняем адзін з этапаў падрыхтоўкі вучняў да выканання будучага задання па ўроку РМ.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**5. Урок № 11** – *Ян Баршчэўскі. “Вужыная карона”*. Паколькі на гэтым уроку, акрамя іншага, павінна адбывацца “*ўдасканальванне ўменняў вучняў вызначаць сэнсавыя часткі, складаць план*” [3], то варта ў працэсе такой працы ў кантэксце аналізу твора Яна Баршчэўскага звярнуцца да наступных форм паралельнай падрыхтоўчай працы да выканання задання па ўроку РМ.

**5.1** Вызначэнне асаблівасцей і структуры апавядальнай гісторыі Яна Баршчэўскага (*вобраз апавядальніка*, ад імя якога ўзнаўляецца гісторыя; *уступ-завязка*: інфармацыя пра галоўнага героя (месца жыхарства, абавязкі па службе, заданне аканома, няўдача пры выкананні задання); *асноўная частка*: здарэнні з Сямёнам (сустрэча з чорным сабакам, кароткая гутарка з пажылым чалавекам (нячысцікам), шлях Сямёна на Ласіную гару, сустрэча з чарадой вужоў і Вужыным каралём, атрыманне паляўнічым Вужынай кароны, удачы ў лавецкай справе Сямёна пры дапамозе нячысціка, абраза паляўнічым нячыстай сілы і помста апошняй яму; *заключэнне*: нячыстая сіла не пакідае ў спакоі Сямёна.

**5.2** Праекцыя вызначанага вышэй на падрыхтаваныя раней вучнямі замалёўкі. Формы працы: **а)** праблемнае пытанне-заданне настаўніка (вызначыць, што варта дадаць да падрыхтаваных шасцікласнікамі раней замалёвак, каб узятая з падручніка інфармацыя, некаторыя вучнёўскія дапаўненні да яе ператварыліся ў сапраўдную апавядальную гісторыю (замалёўку-гісторыю)[1], падобную формай да твора Яна Баршчэўскага); **б)** падрыхтоўка адказу на яго вучнямі на аснове аналізу іх замалёвак пра багоў (духаў); **в)** выказванні аднаго-двух вучняў. Такім чынам здзяйсняецца чарговы этап назапашвання ведаў і ўменняў на перспектыву ў кантэксце падрыхтоўкі і выканання задання па ўрока РМ.

**6. Урок № 12** – *Максім Багдановіч. “Вадзянік”*. Паколькі гэты ўрок паводле яго задач і матэрыялу, які на ім павінен аналізавацца, дазваляе “сэканоміць” час і вылучыць у ім этап падрыхтоўкі да ўрока РМ, то такі этап можа здзяйсняцца пры праверцы дамашняга задання наступным чынам.

**6.1.** Пасля пераказу адным вучнем “Вужынай кароны” Яна Баршчэўскага варта прапанаваць шасцікласнікам звярнуцца яшчэ раз да самастойнага аналізу падрыхтаваных імі замалёвак пра паганскіх багоў (духаў). Мэта такога аналізу: падрыхтаваць расказванне ўслых пашыранага варыянта замалёўкі. У дадзеным выпадку адбываецца адзін з этапаў у працэсе ператварэння вучнёўскіх замалёвак у замалёўкі-гісторыі.

**7. Урок № 14** – *Казімір Камейша. “Камень ля вёскі Камень”*. Своеасаблівым вынікам аналізу вобразнага ладу верша К. Камейшы могуць стаць наступныя формы працы на перспектыву ўрока РМ.

**7.1** Заданне: прыдумаць вобразныя азначэнні, параўнанні для тых дзеючых асоб, аб’ектаў, з’яў, якія вучні ўжылі ў іх ранейшых замалёўках-гісторыях.

---

[1] Паколькі ПКТП, на якое тут спасылаемся, “*прыкладнае*” і для гэтага блока ўрокаў прапаноўвае падобныя паводле формы і зместу заданні да розных урокаў, то з мэтай фарміравання творчых здольнасцей вучняў у дадзеным выпадку мэтазгодна карэкціраваць змест ПКТП у адносінах да ўрокаў ПЧ і РМ.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**7.2** Зачытванне некаторымі вучнямі словазлучэнняў, у якіх утрымліваюцца вобразныя і параўнальныя характарыстыкі.

**8. Урок № 15** – *Урок развіцця маўлення "Мой свет загадак і цудаў"*. Асноўная яго мэта – *абагульніць і сістэматызаваць веды вучняў, набытыя пры вывучэнні раздзела падручніка "Свет загадак і цудаў"* [3]. Формы працы і іх змест могуць быць наступнымі.

**8.1** Праверка дамашняга задання: **а)** выразнае чытанне верша К. Камейшы і адказы на пытанні з падручніка да твора; **б)** характарыстыка (пры дапамозе пытанняў з падручніка) народнай легенды " Палешукі і палевікі".

**8.2** Паўтарэнне з мэтай сістэматызацыі ведаў вывучанага раней матэрыялу. Форма – адказы з дапамогай падручніка на пытанні: **а)** што такое міф; **б)** як, пры дапамозе чаго вытлумачваюцца з'явы прыроды ў міфе; **в)** з якой мэтай людзі адухаўлялі прыроду; якіх багоў, міфічных істот ведаюць вучні; **г)** ці зніклі з народнай памяці старыя багі, чаму; у якой форме захавалася памяць пра іх у свядомасці народа і мастацкай літаратуры; **д)** якая форма і якія вобразныя сродкі характарыстыкі міфічных істот могуць выкарыстоўвацца ў мастацкіх творах. Такім чынам, паколькі ПКТП прапаноўвае падрыхтоўку замалёўкі "*з апорай на літаратурныя і жывапісныя творы*", то настаўнік з улікам гэтага можа засяродзіць увагу пры падрыхтоўцы вучняў да выканання гэтага задання на літаратурных творах, артыкулах з падручніка, якія раней вывучаліся, зыходзячы з наступнага. Гэтыя крыніцы даюць не толькі інфармацыю пра паганскіх багоў, міфічных духаў, істот, а яшчэ і дэманструюць, як іх вобразы могуць адлюстроўвацца ў слоўнай форме. У гэтым сэнсе літаратурныя тэксты, з якімі вучні пазнаёміліся раней, – гэта не толькі фактычны, а і формаўтваральны, стылёвы падмурак, на грунце якога шасцікласнікі могуць падрыхтаваць канчатковы варыянт замалёўкі-гісторыі ўжо на ўроку РМ і ў працэсе выканання задання па ім. У дадзеным выпадку тыя замалёўкі-гісторыі, з якімі вучні працавалі ў кантэксце папярэдніх урокаў, абсалютна абгрунтавана могуць быць імі выкарыстаны ў якасці асновы для далейшай (на ўроку і дома) творчай працы.

**8.3** Непасрэдная падрыхтоўка да канчатковага выканання вучнямі задання па ўроку РМ. Формы дзейнасці настаўніка і вучняў: **а)** настаўнік агучвае канчатковае заданне, якое вучні павінны падрыхтаваць дома; **б)** праца вучняў пад кіраўніцтвам настаўніка ў творчых групах (кожная асобная група аб'ядноўвае тых вучняў, якія раней стварылі замалёўкі з выкарыстаннем аднаго і таго паганскага бога альбо міфічнай істоты): выбар шасцікласнікамі кіраўніка групы; тлумачэнне настаўнікам парадку працы ў групах (некаторыя аўтары гісторый-замалёвак агучваюць створаныя імі гісторыі, а кіраўнік наладжвае іх абмеркаванне з мэтай характарыстыкі логікі развіцця падзей); праца ў групах; падвядзенне вынікаў працы ў групах настаўнікам і вызначэнне перспектыў іх выкарыстання пры выкананні дамашняга задання па дадзеным уроку РМ (пры канчатковай падрыхтоўцы замалёўкі-гісторыі вучні, якія непасрэдна атрымалі заўвагі ад сваіх аднакласнікаў, павінны іх улічыць; тыя ж з шасцікласнікаў, якія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не змаглі агучыць у групе свае гісторыі, мусяць улічыць парады аднакласнікаў і настаўніка калегам па творчай групе, каб не паўтараць падобныя памылкі ў сваіх канчатковых варыянтах творчых работ.

**8.4** Падвядзенне вынікаў па ўроку.

Прапанаваныя тут этапы і формы працы па сістэме перспектыўных ліній спрыяюць наступнаму: фарміраванню ўменняў аналізу навучальнага літаратурнага тэксту з падручніка, мастацкіх твораў, выканання дамашніх заданняў з паралельным паступовым назапашваннем неабходных ведаў і ўменняў для выканання творчага задання па ўроку РМ.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. **Бельскі, А.І.** Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А.І. Бельскі, Л.К. Цітова. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 320 с.
2. **Макарэвіч, А.М.** Урокі пазакласнага чытання і развіцця маўлення ў пятым класе / А.М. Макарэвіч // Фальклор і сучасная культура : матэр. III Міжнар. навук.-практ. канф., 21-22 крас. 2011, Мінск: у 2 ч. Ч. 1; рэдкал.: І.С. Роўда і інш. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2011. – С. 213-214.
3. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" на 2010/2011 навучальны год (V клас агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання) // http://www.adu.by/modules.php?name=News&file=article&sid=6603. – Дата доступу: 09.03.2011.